

# Нябачныя **героі** сярод нас

**Вікторыя Харытонава**

Фотавыстава «Нябачныя героі» ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі паказвае жыццё як цуд, дзе кожны — магутны добры чараўнік.

Праект арганізаваны сумесна з грамадскай дабрачыннай арганізацыяй «Беларускі дзіцячы хоспіс», мэта — прыцягнуць увагу да праблемы дзіцячых хвароб і дзейнасці хоспіса, падтрымаць пацыентаў і іх сем'і, пазнаёміць шырокую грамадскасць з праблемамі такіх сем'яў праз моцныя і глыбокія фотавобразы. Выстава здзейснілася дзякуючы ініцыятыве кіраўніцтва хоспіса, дырэктару Ганне Гарчаковай, супрацоўніку Юліі Камагорцавай і, вядома, таленту фатографаў Ксеніі Ляговіч (валанцёр, студэнтка) і Ульяны Казакевіч (супрацоўніца хоспіса), якія на дабрачынных пачатках арганізавалі фотаздымку.

У экспазіцыі — партрэты падапечных хоспіса, што паўстаюць у вобразах беларускіх міфічных персанажаў, герояў беларускіх казак. 45 фотаздымкаў — акенцаў у свет мрояў і надзеі, свет моцнай падтрымкі, сілы і мудрасці народнай традыцыйнай культуры. Калісьці, калі навальніцу, замаразкі і неўраджай цяжка было растлумачыць, кожны з міфічных персанажаў быў вельмі значным, у кожнага з іх прасілі ласкі, дапамогі, прыносілі ім ахвяры, дзякавалі. Кожная магутная істота старажытнага беларускага фальклору валодала не толькі магічнымі здольнасцямі, але і няпростым характарам. З цягам часу багі сталі персанажамі дзіцячых казак. Вонкавыя і асабістыя іх рысы красамоўна і жывапісна перададзены на выставе. Дзевяць рэальных герояў становяцца дзевяццю міфічнымі істотамі, прадстаўленымі ў фотасерыях.



Глыбокая мудрасць і моц беларускай міфалогіі дзеліцца з тымі, хто яе ўвасабляе, імкнецца зразумець і натхніцца. Небяспечная Азярніца ў выкананні Кацярыны



Ляшко вабіць прыгажосцю, але і транслюе ўнутраную моц гераіні, яе ўладарства над цёмнымі водамі і жыццём. Бай, увасоблены Андрэем Сіваковым, нібыта поўніцца ведамі стагоддзяў, ён абавязкова закалыша пасля перанесеных цяжкасцей і мітрэнгаў, яго розум здолее зразумець і выбачыць сусвет. Вельмі натуральным атрымаўся вобраз Еўніка ў Рамана Кукрэша: сялянская хата, сноп жыта, заліхвацкія вусы — ён будзе пільна сачыць, каб жыхары не acipaлі бакі.



Навагодні, казачны, дзівосны Зюзя ў выкананні Максіма Бойчанкі. Усмешка маленькага Зюзі пераконвае: усе навагоднія жаданні абавязкова павінны спраўдзіцца.
Таямнічай выглядае фігура Капялюшніка. Максім Бекус настолькі ўвайшоў у ролю, што прыцемак, ліхтар, плашч і агульны настрой фотаздымка робяць вельмі фантастычнае ўражанне — нібы перад намі блукальны агеньчык альбо пярэварацень. Паляся Дар'і Загароўскай — шчырая, вясёлая, сонечная. Вочы, твар, усмешка, нацыянальны касцюм і абярэмак жыта ў руках — увасобленыя дзяўчынай плённае лета і дух поля.
Пячурнік у выкананні Рыгора Доўгіх — утульны, надзейны, гасцінны. Дабрабыт хаты залежыць ад яго, і можна быць упэўненымі: гаспадары будуць шчаслівыя, пры добрым стаўленні ён абавязкова папярэдзіць аб небяспецы. Надзвычайна ўражвае вобраз Цара-вужа Германа Саламаціна. Высокія магутныя дрэвы, карона, выразныя рысы





твару, пярсцёнак і трон… Цар-вуж можа навучыць гаварыць на мове жывёл, але не спрабуйце адабраць яго карону хітрасцю — змяінае войска тут жа дагоніць і пакарае… Вельмі эмацыянальная серыя дазваляе паверыць і ўявіць, як высакародная, непадробная сіла лесу, яго кронаў, ствалоў дапамагае хлопцу пераадолець усе цяжкасці. Смарагдавым ззяннем зіхаціць Цмок Макара Рудніцкага — містычная істота, герой казак і легенд, якому падуладна ўсё, асабліва ў 2024-м — годзе зялёнага драўлянага цмока па кітайскім календары…
Фота выразна і жывапісна распавядаюць аб небяспечнай азярніцы, мудрым баі, дзівосным зюзі, казачным цмоку — але ж нябачныя героі выстаўкі не яны адны. Міфы аб «нябачных героях» жывуць між людзей, якія не заўсёды вераць, не заўважаюць містычнасці прадметаў і прыроды, не могуць іх убачыць, але час ад часу адчуваюць іх прысутнасць. Такая ж часам незаўважная прысутнасць людзей з інваліднасцю, хаця пераадольваць штодзень надзвычайныя цяжкасці — сапраўдны цуд. Фотавыстава «Нябачныя героі» заахвочвае быць уважлівымі, чулымі, знаёміць з сапраўднымі нябачнымі героямі: Кацярынай Ляшко, Андрэем Сіваковым, Раманам Кукрэшам, Германам Саламаціным, Макарам Рудніцкім і іншымі падапечнымі хоспіса. Трэба не забываць пра тых, хто побач, — і навучыцца бачыць дзівоснае ў звычайным жыцці. Як гэта робяць надзвычай добразычлівыя, шчырыя супрацоўнікі хоспісу, фотамастакі, блізкія Максіма, Дар'і, Рыгора і інш. Выстава дорыць нам магчымасць убачыць не 9, а 18 герояў — 9 казачных і 9 абсалютна рэальных. Кожны з удзельнікаў па-сапраўднаму добры ўсёмагутны чараўнік і на фота і па-за ім. А цуды… Яны побач — трэба толькі захацець убачыць.